ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР № 3 1972
СЕРЫЯ ГРАМАДСКІХ НАВУК

Э. Р. ІОФЕ

# ДАСЛЕДАВАННЕ СТАНОВІШЧА ЧЭЛЯДЗІ НЯВОЛЬНАЙ У ПРАЦАХ У. І. ПІЧЭТЫ

Адной з важнейшых і складанейшых праблем гісторыі Беларусі з'яўляецца пытанне аб становішчы беларускага сялянства ў эпоху феадалізму. Як вядома, сялянства складала асноўную масу насельніцтва і галоўную вытворчую сілу беларускага феадальнага грамадства. Асобую групу феадальна-залежнага сялянства ў Беларусі складала чэлядзь нявольная.

З другой паловы XIX ст. гэта катэгорыя сялянства стала прадметам спецыяльнага вывучэння рускіх і ўкраінскіх гісторыкаў. Іменна ў гэты час быў напісан рад прац, у якіх у той ці іншай меры разглядаецца становішча чэлядзі нявольнай у Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст. [1]

Першым да гэтай тэмы звярнуўся Ф. І. Леантовіч. Ён выказаў думку аб нешматлікасці чэлядзі нявольнай у пачатку XVI ст. Ф. І. Леантовіч лічыў, што к палове XVI ст. колькасць чэлядзі нявольнай павялічылася, але ён не растлумачыў, чаму гэта адбылося. Леантовіч першы пачаў вывучаць крыніцы халопства, цікавячыся толькі юрыдычным бокам гэтай праблемы.

Новыя дакументы аб чэлядзі нявольнай у феадальных маёнтках апублікаваў І. Навіцкі. У сваёй кнізе ён таксама закрануў пытанне аб крыніцах халопства. Ён выказаў думку, што калі парабкі — патомкі рабоў, то можна лічыць, што парабкі з'яўляюцца сувязным звяном паміж нявольнікамі ў цесным сэнсе і отчычамі, прыгоннымі, з якімі яны затым зліліся [2].

Праблему чэлядзі нявольнай уздымаў у сваіх даследаваннях і У. Б. Антановіч. На яго думку, быў такі момант, калі чэлядзь нявольная стала отчычамі [3].

М. С. Грушэўскі, акрамя спробы вывучыць крыніцы халопства, цікавіўся пераходам чэлядзі нявольнай у цяглае сялянства ў другой палове XVI ст.[4]

Пэўная заслуга ў асвятленні становішча чэлядзі нявольнай належыць М. К. Любаўскаму. Так, ён упершыню выказаў думку, што чэлядзь нявольная складала перш за ўсё рабочую сілу пры ўсякім гаспадарскім двары [5]. Такім чынам, Любаўскі першым закрануў пытанне

[1] «Киевские университетские известия» № 10, 1863, стр. 9—71; Ф. И. Леонтович. Из истории административного строя Литовского государства. Варшава, 1899; И. Новицкий. Очерк истории крестьянского сословия в Юго-Западной России в XV—XVIII вв. Киев, 1877; М. К. Любавский. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства. М., 1892; М. К. Любавский. Очерк истории Литовско-Русского государства. М., 1915; М. С. Грушевський. Історія України-Руси, т. V. Львів, 1905; В. Б. Антонович. Архив Юго-Западной России (ЮЗР), ч. VI, т. II. Киев, 1870, стр. 1—64.

[2] И. Новицкий. Очерк истории крестьянского сословия в Юго-Западной России в XV—XVIII вв., стр. 49—50.

[3] Архив ЮЗР, ч. VI, т. II, стр. 11.

[4] М. Грушевський. Історія України—Руси, т. V, стор. 115—117.

[5] М. К. Любавский. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства, стр. 314.

аб гаспадарчым значэнні халопства для феадальнага маёнтка. Ён сцвярджаў, што паміж парабкамі і чэляддзю нявольнай няма ніякай розніцы. М. К. Любаўскі адзначыў, што крыніцы халопства ў Вялікім княстве Літоўскім тыя ж самыя, што і ў старажытнарускай дзяржаве: купля, палон, натуральнае нараджэнне, шлюб з нявольным чалавекам [6]. Ён спрабаваў паказаць уплыў аграрнай рэформы 1557 г. на становішча чэлядзі.

Такім чынам, папярэднікі Пічэты ў праблеме чэлядзі сканцэнтравалі сваю ўвагу перш за ўсё на пытаннях паходжання гэтай катэгорыі залежнага насельніцтва. У значна меншай ступені імі вывучалася пытанне аб гаспадарчай ролі чэлядзі нявольнай і зменах у яе лёсе. І тое і другое пытанне папярэднікі Пічэты вывучалі з пазіцый дзяржаўнай школы. Іх цікавілі галоўным чынам юрыдычныя нормы, што вызначалі чэлядзь, і ў меншай ступені эканамічныя вытокі яе фарміравання. Свае даследаванні гэтыя гісторыкі будавалі на аснове вывучэння юрыдычных дакументаў і толькі ў вельмі невялікай ступені выкарыстоўвалі асобныя выпіскі з Пісцовых кніг.

Але найбольш поўная характарыстыка чэлядзі нявольнай у XV—XVI стст. дадзена ў даследаваннях акадэміка У. І. Пічэты. Варта падкрэсліць, што за апошнія 25 год напісана некалькі артыкулаў аб навуковай дзейнасці вучонага [7]. Аднак даследаванне Пічэтам праблемы чэлядзі нявольнай аўтары гэтых артыкулаў не закранаюць.

У. І. Пічэта каля 40 гадоў займаўся вывучэннем становішча чэлядзі нявольнай. Гэта тэма разглядаецца ў радзе яго прац [8].

У даследаваннях вучонага пэўнае месца займае гістарыяграфія пытання. Найбольш падрабязна яна распрацавана ў артыкулах У. І. Пічэты «Юрыдычнае становішча сельскага насельніцтва на прыватнаўласніцкіх землях к часу выдання Літоўскага статута 1529 г.» (1928—1929) і «Інстытут халопства ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст.» (1946). Як і яго папярэднікі, ён вывучаў крыніцы фарміравання чэлядзі нявольнай, яе гаспадарчую ролю, прававое становішча. Разам з тым Пічэта ўсю праблему ставіць значна шырэй, паколькі паказвае значэнне чэлядзі ў эканоміцы маёнтка, дае канкрэтную характарыстыку гаспадарчых абавязкаў чэлядзі ў феадальным маёнтку. Асабліва важна тое, што Пічэта першы паслядоўна і сканцэнтравана паспрабаваў раскрыць эвалюцыю дадзенай групы феадальна залежнага насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным аспекце. Тым самым Пічэта выйшаў за вузкія рамкі фармальна-юрыдычнага аналізу і зрабіў першы значны крок у бок шырокага гістарычнага даследавання тэмы. Такі напрамак усяго даследавання Пічэты азначаў важны для таго часу

---

[6] М. К. Любавский. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1910, стр. 96.

[7] Ученые записки Московского гос. пед. ин-та им. В. И. Ленина, т. 60. Кафедра истории СССР, вып. 2, 1949, стр. 7—15; Ученые записки Ин-та славяноведения АН СССР, т. 1. М., 1949, стр. 7—14; «Полымя» № 5, 1967, стар. 251—252; «Вопросы истории» № 8, 1970, стр. 72—85.

[8] Русская история в очерках и статьях, т. 2. М., 1910, стр. 337—439; В. И. Пичета. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве, ч. 1—2. М., 1958; Курс белоруссоведения. М., 1918—1920, стр. 1—84; В. И. Пичета. История Литовского государства до Люблинской унии. Вильно, 1921; В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. М., 1961, стр. 21—423, 43—60, 61—92, 633—714; В. І. Пічэта. Гісторыя Беларусі, ч. І. М.—Л., 1924; В. И. Пичета. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии, ч. I (до конца XVI в.). Минск, 1927; Западная Белоруссия. Сб. статей, кн. І. Минск, 1927, стр. 41—90; В. И. Пичета. Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Белоруссии. М., 1940; «Исторические записки», т. 20, 1946, стр. 38—65 і інш.

крок уперад у распрацоўцы не толькі пытання чэлядзі, але ўсёй праблемы аграрных адносін у Беларусі ў XV—XVI стст.

Трэба заўважыць, што, як правіла, даследаваннем сялянства займаліся не ўласна гісторыкі, а юрысты. Што датычыць гісторыкаў, то і яны аказаліся пад уплывам юрыдычнага падыходу да гэтага пытання. І на гэту абставіну звяртае ўвагу сам Пічэта.

Разглядаючы творы сваіх папярэднікаў, У. І. Пічэта не абмяжоўваецца толькі канстатацыяй іх поглядаў, а падвяргае гэтыя погляды крытычнаму аналізу.

Так, адзначаючы ролю Ф. І. Леантовіча як першага даследчыка крыніц халопства, У. І. Пічэта ўказвае, што яго цікавіць толькі юрыдычная норма, якая характарызуе прававое становішча халопаў, але гэта норма разглядаецца Леантовічам без сувязі з сацыяльна-эканамічным асяроддзем, без вывучэння яе становяцца невытлумачальнымі як эвалюцыя халопства, так і яго заканадаўчая адмена [9].

Пічэта канстатуе, што ні Леантовічу, ні Навіцкаму не ўдалося высветліць крыніцы халопства.

Крытыкуючы погляд В. Б. Антановіча, што «чэлядзь нявольная» ў нейкі момант стала «отчычамі», Пічэта заўважае, што Антановіч правы толькі ў тым, што частка чэлядзі нявольнай магла стаць отчычамі, г. зн. зліцца з існуючымі прыгоннымі людзьмі. Але гэты працэс назіраецца толькі ў другой палове XVI ст.[10]

Пры вывучэнні становішча чэлядзі нявольнай папярэднікі У. І. Пічэты выкарыстоўвалі юрыдычныя дакументы, галоўным чынам матэрыялы Літоўскіх статутаў, Літоўскай метрыкі, а таксама ўставы першай паловы XVI ст., Уставу на валокі 1557 г. Толькі ў некаторых выпадках яны рабілі асобныя выпіскі з Пісцовых кніг.

У. І. Пічэта даследаваў усе крыніцы, якія выкарысталі яго папярэднікі Ф. І. Леантовіч, І. Навіцкі, М. К. Любаўскі, М. С. Грушэўскі, В. Б. Антановіч. Вучоны прымяніў метад супастаўлення зместу літоўскіх статутаў 1529, 1566, 1588 гг. Акрамя гэтага, У. І. Пічэта працаваў над гаспадарчымі інвентарамі, якія захаваліся ў невялікай колькасці. Новым у параўнанні са сваімі папярэднікамі было тое, што У. І. Пічэта ўпершыню шырока выкарыстаў у комплексе матэрыялы Пісцовых кніг, складзеных гаспадарскімі рэвізорамі пры перабудове гаспадаркі вялікакняскіх двароў.

Пічэта правільна разумее сутнасць метадалагічнай пазіцыі папярэднікаў. Памылковасць іх поглядаў ён тлумачыць фармальна юрыдычным падыходам да вывучэння пытання аб чэлядзі нявольнай.

У. І. Пічэта ўказвае, што пад тэрмінам «чэлядзь нявольная» трэба разумець усё несвабоднае насельніцтва. Пад гэтым тэрмінам звычайна разумелі незалежна да полу і ўзросту сукупнасць усёй рабочай сілы нявольных людзей, знаходзіўшыхся ў тым ці іншым вялікакняскім альбо прыватнаўласніцкім маёнтку [11]. Часам, заўважае Пічэта, у дакументах сустракаецца тэрмін «чэлядзь», гэта сведчыць аб тым, што дадзены тэрмін настолькі ўвайшоў у жыццё, настолькі стаў папулярным, што дабаўленне да яго яшчэ другога тэрміну «нявольная» рэдактары юрыдычных дакументаў лічылі залішнім.

У сваіх творах Пічэта прасочвае эканамічнае, сацыяльнае і юрыдычнае становішча чэлядзі.

У адным са сваіх ранніх твораў ён адрознівае дзве групы чэлядзі. Адна частка выкарыстоўвалася ў якасці дваровых слуг, атрымліваючы

[9] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 153.
[10] Там жа, стар. 373.
[11] Там жа, стар. 155—166.

ўтрыманне ад уласніка; другая жыла за дваром, на невялікіх зямельных участках, «прыробках» і мела сваю ўласную рухомую маёмасць — бонду [12].

Праз 7 год У. І. Пічэта больш падрабязна паказвае ролю чэлядзі ў маёнтку. Ён адзначае ўказанне ўставы 1529 г. на магчымасць для чэлядзі нявольнай мець свае бонды і прыробкі. Пічэта лічыць гэта, бясспрэчна, новай з'явай у гаспадарчай палітыцы ўрада Вялікага княства Літоўскага, што паказвае яго імкненне выкарыстаць больш прадукцыйна рабочую нявольніцкую сілу і зменшыць расходы на яе ўтрыманне, звярнуўшы астатак месячыны на патрэбы гаспадарчага двара [13]. На яго думку, чэлядзь нявольная ў XV ст. складала асноўную рабочую сілу гаспадарскіх і прыватнаўласніцкіх маёнткаў, але ў першай чвэрці XVI ст. яна страціла сваё пераважнае гаспадарскае значэнне [14]. У 1927 г. у артыкуле «Гістарычны лёс Заходняй Беларусі» У. І. Пічэта ўдакладніў сваю думку. Ён пісаў: «Спачатку дваровая гаспадарка абслугоўвалася чэляддзю нявольнай, але ўжо з паловы XV ст. чэлядзі нявольнай як рабочай сілы не хапала. Апошняя пачынае ўступаць месца цяглым людзям» [15]. У гэты ж час у другім даследаванні Пічэта выказваецца яшчэ больш катэгарычна, указваючы, што ў першай палове XV ст. чэлядзь была адзінай рабочай сілай, якая непасрэдна эксплуатавалася ў інтарэсах дваровай гаспадаркі. З канца XV ст., адзначаў ён, калі сельская гаспадарка зрабіла некаторы крок уперад, рабы як рабочая сіла ўжо не адпавядалі свайму назначэнню, вялікі князь і прыватныя землеўладальнікі карысталіся працай іншых груп насельніцтва, якія ў адносінах да іх знаходзіліся ў пэўнай залежнасці [16]. З'яўленне такой новай рабочай сілы, падкрэслівае Пічэта, тлумачыцца тым, што чэлядзь нявольная была ўвогуле нешматлікая пры княскіх і прыватнаўласніцкіх дварах, і колькасна яе ўжо было недастаткова для задавальнення патрэб двароў у рабочай сіле [17].

У сваіх даследаваннях У. І. Пічэта ўдзяляе шмат увагі вывучэнню крыніц халопства (чэлядзі нявольнай). Як мы ўжо канстатавалі, значная заслуга ў рашэнні гэтай праблемы належыць М. К. Любаўскаму. Акрамя навуковага аналізу крыніц халопства, названых Любаўскім, У. І. Пічэта выказаў рад важных думак па гэтаму пытанню. Так, ён падкрэсліваў, што часу першага Статута ўжо невядома няволя як пакаранне за невыкананне прынятых на сябе абавязацельстваў.

У. І. Пічэта адзначаў, што пры развіваўшыхся феадальна-прыгонніцкіх адносінах ператварэнне даўжніка ў халопа было яўна нявыгадна: такога халопа трэба было ўтрымліваць. Больш выгадным было выкарыстанне яго рабочай сілы [18]. Ён прыходзіць да вываду, што некаторае скарачэнне крыніц чэлядзі нявольнай у другой чвэрці XVI ст. указвае на тое, што халопства як гаспадарчы інстытут першаступеннай важнасці ўжо адступае на задні план [19].

У многіх працах У. І. Пічэта разглядае пытанне аб прававым становішчы чэлядзі нявольнай. Ён паказвае, што халоп зусім быў пазбаў-

---

[12] Русская история в очерках и статьях, стр. 403.

[13] В. И. Пичета. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве, стр. 96.

[14] У. І. Пічэта. Гісторыя Беларусі, ч. 1, стар. 108.

[15] Западная Белоруссия. Сб. статей, стр. 56.

[16] В. И. Пичета. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии, ч. I, стр. 88.

[17] Там жа.

[18] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 167.

[19] В. И. Пичета. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии, ч. I, стр. 90.

лен працаздольнасці і дзеездольнасці [20]. Калі вялікі князь дараваў той ці іншай асобе населеную зямлю, то звычайна з гэтай зямлёй давалася і чэлядзь нявольная [21].

Пічэта неаднаразова падкрэсліваў, што рабскае становішча — становішча спадчыннае. Гаспадар раба мае права распараджацца ім як рэччу, мае права забіць яго. Таму, калі раба адпускалі на волю, то гэты акт павінен быў быць замацаваны юрыдычным дакументам, без якога вызваленне не мела ніякага значэння [22].

У сваіх даследаваннях У. І. Пічэта робіць спробу паказаць сам маёнтак, заснаваны на працы чэлядзі. Але захаванне вельмі невялікай колькасці інвентароў маёнткаў (гутарка ідзе аб перыядзе канца XV, першай чвэрткі XVI ст.— *Э. І.*) не дазволіла яму дакладна вызначыць удзельную вагу рабочай сілы чэлядзі нявольнай у феадальнай гаспадарцы.

На аснове разгляду развіцця гаспадаркі двара Валкавыйскага, цівунства Віленскага, двара Бірштаны, замка Віцебскага У. І. Пічэта робіць важны вывад, што ў гаспадарцы сядзібы чэлядзь нявольная складала асноўную рабочую сілу, але ў гаспадарцы ўсяго феадальнага маёнтка яна мела мізэрнае значэнне, бо асноўнай рабочай сілай былі цяглыя людзі, прыгонныя сяляне [23]. Гэта думка Пічэты намячае вядомую эвалюцыю ў гаспадарчай ролі чэлядзі. Яе значэнне падае па меры распаўсюджання прыгонніцтва на асноўную масу сялянства.

У. І. Пічэта бачыў у чэлядзі прызнак рабаўладальніцкага ўкладу. Ён пісаў: «Інстытут рабства быў знаёмы Русі ў кіеўскі перыяд гісторыі: літоўска-рускае права яго добра ведае пад імем «парабкаў», халопаў» [24].

У адрозненне ад сваіх папярэднікаў Пічэта даследаваў лёс чэлядзі нявольнай і прычыны, што мянялі яе становішча. Так, у пераўтварэнні чэлядзі нявольнай з асноўнага рабочага элемента ў гаспадарчую сілу другога парадку Пічэта бачыць цікавую падрабязнасць у гісторыі дваровай гаспадаркі першай паловы XVI ст.[25]

Адзначыўшы значэнне эвалюцыі ролі чэлядзі ў гаспадарчым лёсе гаспадарскага двара, Пічэта не паставіў яшчэ ў гэтай рабоце праблемы шырэй, г. зн. не даў ацэнкі гэтай з'яве з пункту гледжання развіцця феадальна-прыгонніцкіх адносін у цэлым. Новы крок уперад зрабіў Пічэта ў артыкуле «Інстытут халопства ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVII стст.», напісаным у 1946 г., дзе ў цэнтры ўвагі ім пастаўлены сацыяльны і эканамічны аспекты ўсёй праблемы.

Першым з савецкіх гісторыкаў У. І. Пічэта імкнуўся прасачыць эвалюцыю халопства ў Вялікім княстве Літоўскім. Ён падкрэсліваў, што без усебаковага вывучэння пытання аб халопстве немагчыма скласці выразнае ўяўленне аб фарміраванні прыгоннага права ў Беларусі і Літве [26].

Важную ролю ў змяненні эканамічнага і юрыдычнага становішча чэлядзі нявольнай адыгралі, лічыў Пічэта, аграрныя мерапрыемствы вялікага князя літоўскага Сігізмунда-Аўгуста.

---

[20] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 172.

[21] В. И. Пичета. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии, ч. I, стр. 58.

[22] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 298.

[23] Там жа, стар. 164.

[24] Русская история в очерках и статьях, т. II, стр. 403.

[25] В. И. Пичета. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве, стр. 152.

[26] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 153.

У. І. Пічэта даказвае, што неабходнасць перамены ў становішчы чэлядзі нявольнай як рабочай сілы было зразумела каралеве Боне, калі яна ўводзіла валочнае вымярэнне (1552—1555 гг.) у Пінскім і Клецкім княствах[27]. Ён прыходзіць да вываду, што на працягу 1560—1566 гг. у гаспадарскіх маёнтках знікла становішча нявольніцтва. Нявольнікі, пасаджаныя на агародніцкія ўчасткі, прыблізіліся па свайму эканамічнаму становішчу і павіннасных адносінах да цяглых сялян[28].

У артыкуле «Інстытут халопства ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст.» У. І. Пічэта будуе сваю пазіцыю больш дасканала. Ён выказвае вельмі важную думку аб тым, што аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, якое адбывалася ў маёнткавай гаспадарцы, патрабавала знішчэння халопства[29]. Тут Пічэта падыходзіць з пункту гледжання грамадскага раздзялення працы. Гэты марксісцкі падыход да вырашэння пытання аб прычынах знікнення чэлядзі нявольнай у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XVI ст. дазволіў яму выявіць важную прычыну эвалюцыі інстытута халопства ў Вялікім княстве Літоўскім.

Усе гаспадарчыя мерапрыемствы вялікакняскага ўрада ажыццяўляліся, адзначаў У. І. Пічэта, пры дапамозе ўзмацнення ўціску на запрыгоньваемае і запрыгоненае насельніцтва феадальнага маёнтка. Разам з тым яны таксама закранапі інтарэсы чэлядзі нявольнай. У. І. Пічэта звяртаў увагу на тое, што прыватныя землеўладальнікі, маючы на мэце павелічэнне прыбытковасці сваіх уладанняў, прымалі меры да арганізацыі сваёй маёнткавай гаспадаркі на паншчынна-прыгонніцкай працы.

Асаджванне рабоў на зямельных участках і права валодання рухомай маёмасцю, бондай, адзначаў Пічэта, з'яўляецца знешнім адлюстраваннем таго глыбіннага працэсу, які адбываўся ў нетрах інстытута чэлядзі нявольнай. Пэўныя змяненні ў яе становішчы трэба тлумачыць адпаведнымі змяненнямі ў арганізацыі вялікакняскай гаспадаркі таго часу, калі праца рабоў стала нявыгаднай, калі пачалі карыстацца працай цяглых людзей, якія разам з чэляддзю нявольнай адбывалі паншчыну і абслугоўвалі сваёй працай гаспадарскія фальваркі[30].

Праз 12 гадоў, у 1940 г., У. І. Пічэта, вярнуўшыся да гэтага пытання, выказаў сваю думку больш дакладна і лаканічна. Ён пісаў: «Патрэбнасць у рабочай сіле прывяла да знікнення «чэлядзі нявольнай» — рабоў, атрымаўшых зямельныя ўчасткі і такім чынам зліваўшыхся з асноўнай групай сельскага насельніцтва, — прыгонным сялянствам»[31].

Варта заўважыць, што побач з іншымі гістарычнымі крыніцамі У. І. Пічэта шырока выкарыстаў у комплексе матэрыялы Пісцовых кніг. На аснове вывучэння гэтых кніг ён прыйшоў да заключэння, што з прычыны малых памераў усяго зямельнага надзелу чэлядзь нявольная, пасаджаная на зямлю, прыбліжалася да становішча агароднікаў, абяднеўшых сялян, пазбаўленых магчымасці ўзяць для апрацоўкі большы па памерах кавалак зямлі[32]. Спасылаючыся на Пісцовую кнігу былога Пінскага староства (1561—1566), У. І. Пічэта даказвае, што раней частка агароднікаў лічылася нявольнымі[33].

[27] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 62.
[28] Там жа, стар. 65.
[29] Там жа, стар. 180.
[30] Там жа, стар. 314.
[31] В. И. Пичета. Основные моменты исторического развития Западиой Украины и Западной Белоруссии, стр. 39.
[32] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 64.
[33] Там жа, стар. 65.

У артыкуле «Інстытут халопства ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст.» Пічэта адзначаў, што вопыт рэарганізацыі феадальнай гаспадаркі, зроблены каралевай Бонай у Пінскім і Клецкім княствах, унёс істотныя змены ў гаспадарчае становішча чэлядзі нявольнай. Але перавод чэлядзі нявольнай на зямлю яшчэ не азначаў знішчэння халопства і поўнага зліцця яго з цяглым насельніцтвам, паколькі яна паранейшаму адносілася да разраду нявольных людзей. Устава на валокі 1557 г. з дапаўненнем 1557—1558 гг. ужо не ўпамінае аб нявольніцтве [34].

Такім чынам, заключае Пічэта, у вялікакняскіх маёнтках знікла халопства як від рабочай сілы пры дварах. Частка яго была асаджана на агародніцкіх валоках; у яе распараджэнне маглі быць перададзены і цяглыя і спецыяльныя валокі, усё залежала ад таго становішча, якое займалі нявольнікі ў гаспадарцы феадальнага маёнтка [35].

Пічэта канстатаваў наяўнасць у Статуце 1566 г. трох крыніц нявольніцтва замест чатырох па Статуту 1529 г. У астатнім, заўважае Пічэта, новы Статут захаваў без змен «нявольніцкае права» першага Статута. Вучоны тлумачыць гэта той абставінай, што ў той час як халопы вялікакняскіх маёнткаў зліваліся з сельскім насельніцтвам, у прыватнаўласніцкіх маёнтках халопы яшчэ заставаліся адасобленымі ад сельскага насельніцтва.

Такое становішча, заўважае Пічэта, магло быць толькі часовым. Ён сам адказвае на гэта пытанне: чаму толькі часовым? На аснове марксіцка-ленінскага аналізу развіцця феадальнага грамадства вучоны прыходзіць да вельмі важнага вываду. Прыватнаўласніцкая гаспадарка, падкрэслівае Пічэта, таксама перабудоўвалася па прынцыпах аграрнай рэформы Сігізмунда-Аўгуста. Арганізацыя паншчынна-прыгонніцкай гаспадаркі патрабавала павелічэння паншчыны! Асаджванне чэлядзі нявольнай станавілася непазбежным і прыводзіла да зліцця яе з прыгонным насельніцтвам. Так канчаткова сфарміравалася адзінае прыгоннае саслоўе, якое знайшло сваё юрыдычнае адлюстраванне ў заканадаўстве [36].

Аналізуючы змест Статута 1588 г., які ўжо не ведае чэлядзі нявольнай, паколькі ўсе крыніцы халопства страцілі сілу, У. І. Пічэта заключае, што гэты Статут падвёў пэўныя вынікі працягламу працэсу афармлення прыгоннага права, юрыдычна замацаваўшы як знішчэнне халопства, так і зліццё чэлядзі нявольнай з прыгонным насельніцтвам [37].

Даследаванні акадэміка У. І. Пічэты, яго навуковы пошук, імкненне ўсебакова разгледзець праблему чэлядзі нявольнай у Беларусі і Літве з'явіліся штуршком да далейшага вывучэння гэтай важнай тэмы.

Савецкія гісторыкі, даследуючы праблему чэлядзі, выкарыстоўваюць творчую спадчыну У. І. Пічэты, высока ацэньваюць яго заслугі ў вывучэнні гэтага пытання.

Так, Б. Д. Грэкаў адзначаў, што, вывучаючы лёс найбольш часта сустракаўшыхся разнастайнасцей сельскага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку і чэлядзі нявольнай, у XV і пачатку XVI ст. У. І. Пічэта паставіў усю праблему па-новаму і зрабіў вялікі крок уперад па шляху яе вырашэння [38].

С. В. Бахрушын назваў артыкул У. І. Пічэты «Інстытут халопства ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст.» «маленькім шэдэўрам па

---

[34] В. И. Пичета. Белоруссия и Литва XV—XVI вв., стр. 179.
[35] Там жа, стар. 181.
[36] Там жа, стар. 182.
[37] Там жа.
[38] Б. Д. Греков. Крестьяне на Руси, кн. I. М., 1952, стр. 420.

глыбіні думак і па таму майстэрству, з якім аўтар устанаўлівае сувязь сацыяльных з'яў са з'явамі эканамічнымі» [39].

А. П. П'янкоў лічыць, што юрыдычнае становішча чэлядзі нявольнай пасля даследаванняў У. І. Пічэты ў цяперашні час спрэчак не выклікае [40].

Прызнаючы ўклад Пічэты ў марксісцкае асвятленне праблемы чэлядзі нявольнай, савецкія гісторыкі-аграрнікі зрабілі і рад крытычных заўваг у яго адрас.

Цікавую думку выказаў Ю. М. Юргініс. Прызнаючы правамерным вывад У. І. Пічэты аб чэлядзі як пастаянным інстытуце халопства, Ю. М. Юргініс разам з тым падкрэслівае, што ў адносінах да Літвы вывад Пічэты патрабуе пэўнага ўдакладнення, паколькі ў дакументах этнаграфічнай Літвы чэляддзю называліся нявольныя людзі, якія не мелі сродкаў вытворчасці і вялі ўласную хатнюю гаспадарку [41].

Такім чынам, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў Ф. І. Леантовіча, В. Б. Антановіча, І. Навіцкага, М. К. Любаўскага, М. С. Грушэўскага У. І. Пічэта больш удзяліў увагі характарыстыцы сацыяльнага і эканамічнага становішча чэлядзі, паказаў эвалюцыю чэлядзі як працэс пераўтварэння яе ў прыгонных сялян. Ён асабліва звярнуў увагу на такія важнейшыя фактары, мяняўшыя лёс чэлядзі, як аграрныя мерапрыемствы Сігізмунда-Аўгуста і аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, што адбывалася ў маёнткавай гаспадарцы.

Аднак у тлумачэнні лёсу чэлядзі нявольнай У. І. Пічэта больш схільны да канстатацыі фактаў, узятых з юрыдычных дакументаў. Значна слабей выступае ў яго даследаваннях роля феадальна-прыгонніцкіх адносін як асноўнай прычыны, прывёўшай да знікнення гэтай катэгорыі сялянства.

Указваючы на тое, што чэлядзь нявольная станавілася нявыгаднай, паколькі на землеўладальніку ляжаў абавязак утрымліваць яе, Пічэта не высвятляе, пры якіх абставінах гэта прычына стала дзейсным фактарам знікнення чэлядзі. Застаецца нявысветленым і тое, што зрабіла нявыгадным утрыманне чэлядзі.

Такім чынам, з творчасцю У. І. Пічэты звязан новы этап у распрацоўцы гісторыі аграрных адносін у Беларусі ў XV—XVI стст. У той меры, у якой У. І. Пічэту ўдалося пераадолець вузкасць фармальна юрыдычнай школы ў гістарыяграфіі, ён сфармуляваў рад новых вывадаў і назіранняў. Аднак разгорнутае, глыбокае рашэнне задач якія паставіў і вырашыў У. І. Пічэта, было дасягнута на аснове засваення марксісцка-ленінскай метадалогіі. Гэта дазволіла творча развіць лепшыя бакі спадчыны У. І. Пічэты і крытычна пераадолець слабыя бакі даследаванняў вучонага.


### Резюме

В статье рассмотрены взгляды академика В. И. Пичеты на положение, социально-экономические признаки, источники формирования и эволюцию челяди невольной в XV—XVI вв. Дается оценка исследований В. И. Пичеты видными советскими историками.

Проводится сопоставление взглядов В. И. Пичеты с его предшественниками, устанавливаются изменения, которые претерпела точка зрения ученого в оценке и характеристике данной категории сельского населения Белоруссии и Литвы в XV—XVI вв.


[39] Ученые записки Ин-та славяноведения АН СССР, т. 1, 1949, стр. 8.

[40] Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г. Минск, 1964, стр. 108.

[41] Ю. М. Юргинис. Закрепощение крестьян в Литве. Вильнюс, 1962, стр. 308